*Ю.В. Амбражэй*
БДЭУ (Мінск)

# ПРАВА НАСЛЕДВАННЯ ФАКТЫЧНЫХ СУПРУГАЎ У САВЕЦКІМ ЗАКАНАДАЎСТВЕ 20-Х ГАДОЎ

На працягу многіх гадоў заканадаўства стаяла на той падставе, што толькі грамадзянскі (зарэгістраваны) шлюб выклікае правы і абавязкі супругаў. Аднак ужо ў той час прызнаваліся судом і фактычныя шлюбныя адносіны. Так, на фактычных супругаў практыка пашырала ўсе прававыя нормы, якія рэгулююць маемасныя адносіны. Аднак, зрабіць з гэтага канчатковыя вывады, пашыраючы прызнанне фактычнага шлюбнага супольнага жыцця таксама і на права наследвання, судовая практыка 20-х гг. ХХ ст. не знайшла магчымым.

У першай палове 20-х гадоў раз'ясненні Пленума Вышэйшага Суда РСФСР аб тлумачэнні законаў па ўсіх пытаннях судовай практыкі лічыліся абавязковы для ўсіх судовых устаноў. Вось чаму асаблівую цікавасць выклікаюць пастановы Вышэйшага Суда.

Пытанне аб тым, ці з'яўляецца фактычная жонка спадкаемцай свайго памерлага фактычнага мужа ўзнікла з самага пачатку аднаўлення права наследвання, але не было вырашана канчаткова ў асобных саюзных рэспубліках доўгі час. Заканадаўства БССР, як і РСФСР, прызнавала права наследвання за фактычнай жонкай. Так, Кодэкс законаў аб шлюбе, сям'і і апецы 1927 г. не ўстанаўлівае строгага правіла, што толькі грамадзянскі шлюб карыстаецца афіцыйным прызнаннем. Адсюль вынікае, што і фактычныя супругі павінны карыстацца ўзаемнымі спадчынымі правамі. У сваю чаргу, у Кодэксе Законаў аб сям'і, апецы і шлюбе УССР, арт. 104 строга рэгламентуе, што ў УССР прызнаецца сапраўдным толькі грамадзянскі шлюб. На погляд жа Вышэйшага Суда фактычную жонку і тады можна разглядаць як спадкаемцу свайго фактычнага мужа, калі зарэгістраваны шлюб яго афіцыйна не парваны, і, такім чынам, фармальна існавала дваяжонства.

Аднак, з пункту гледжання тагачаснага заканадаўства, пытанне аб наследванні фактычных супругаў разглядвалася наступным чынам.

Па-першае, у вырашэнні такіх спраў выкарыстоўваўся Кодэкс Законаў аб сям'і, шлюбе і апецы РСФСР, які быў уведзены ў сілу з 1 студзеня 1927 г. Аднак гэты Кодэкс не мог ўжывацца да спадчыны, якая адкрылася пасля смерці асобы, памершай да ўваходжання гэтага закону ў сілу.

Па-другое, ці мела права наследвання фактычная жонка, калі зарэгістраваны шлюб яе фактычнага мужа не быў скасаваны? Адказ на гэтае пы-

таннс можна знайсці ў Грамадзянскіх Кодэксах усіх Савецкіх Рэспублік: "жонка, шлюб якой з спадчынададаўцаю не зарэгістраваны, наследуе толькі пры адсутнасці ў спадчынададаўцы жонкі, якая знаходзіцца з ім у зарэгістраваным шлюбе". Гэтая норма ўдакладняецца ў арт. 459 Грамадзянскага Кодэксу РСФСР, у якім катэгарычна гаворыцца, што круг асоб, якія прызываюцца да наследвання, абмяжоўваецца прамымі нісходзячымі (дзецьмі, унукамі і праўнукамі), перажыўшым супругам (але не перажыўшымі супругамі) і ўтрыманцамі спецыяльнай кваліфікацыі.

Па-трэцяс, пры канкурэнцыі двух жонак, якія прэтэндуюць на спадчыну, пакінутую пасля смерці іх супруга, павінна быць аддадзена перавага той з іх, якая раней увайшла з ім у шлюбныя адносіны, калі толькі гэтыя адносіны не спыніліся і не будуць судом прызнаны спыненымі. Так як другі фактычны шлюб, пакуль існуе першы зарэгістраваны шлюб, не адпавядае агульным прынцыпам шлюбнага заканадаўства.

Такім чынам, ў РСФСР і іншых савецкіх рэспубліках існавала неадпаведнасць паміж раз'ясненнямі Пленума Вышэйшага Суда і агульным сэнсам савецкага заканадаўства. Што, безумоўна, выклікала небяспеку для судовай практыкі 20-х гг. XX ст., звязанай з некрытычным успрыманнем усіх указанняў Вышэйшага суда.

***А.Ю. Белая***
БГЭУ (Минск)

## БРАК И РАЗВОД В ПРЕИОД ДО ПРИНЯТИЯ ХРИСТИАНСТВА

Бракоразводные нормы появляются в Древней Руси только после принятия христианства, когда они были позаимствованы вместе с христианской религией из Византии. Однако языческая Русь имела и свое собственное юридическое воззрение на развод.

Как свидетельствует летопись, славяне практиковали три формы брака: умычка насильственная (похищение девиц), умычка добровольная (увод девиц по предварительному соглашению их с женихами), приведение невесты в дом жениха.

1. Умычка. Осуществлялась путем насильственного захвата жен. Существование брака в форме похищения подтверждается, кроме летописи, и позднейшими свидетельствами, относящимися к христианской эпохе. Какое же влияние на развод может оказывать эта форма брака? Никакого. То есть развода, в смысле правильного прекращения брака, при такой форме быть не могло.



БДЭУ. Беларускі дзяржаўны эканамічны універсітэт. Бібліятэка.
БГЭУ. Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.°.
BSEU. Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by elib@bseu.by